УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
_________________Ю.П.Бондар
“____”_________________2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч.

# СЕМІЁТЫКА КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная)*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*Ю. В. Чарняўская,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

**Рэцэнзенты:**

*Ю. Г. Болатава,* дацэнт кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі "Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава", кандыдат культуралогіі;

*В. У. Сашчэка,* кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 3 ад 17.11.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 3 ад 14.12.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *Ю. В. Чарняўская*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Семіётыка культуры” прызначана для студэнтаў БДУ культуры і мастацтваў і звязана з шырокім колам дысцыплін гуманітарнага цыкла: культуралогіяй, філасофіяй, сацыялогіяй, мастацтвазнаўствам, культурай штодзённасці, антрапалогіяй культуры і інш.

*Мэта дысцыпліны* – з дапамогай звароту да мовы, літаратуры, жывапісу, музыкі, кіно, абрадаў, рытуалаў і г.д. сфарміраваць у студэнтаў уяўленне аб семіётыцы культуры, аб шляхах яе даследавання, аб яе феноменах і семіятычна абумоўленых сацыяльных рэакцыях, як наўмысных, так і ненаўмысных (латэнтных).

*Задачы дысцыпліны*:

– вызначыць месца семіётыкі культуры ў цэласным кантынууме культуралогіі;

– размежаваць розныя тыпы знакавых сістэм: прыродазнаўчых, вобразных, вербальных, сістэм запісу; паказаць спецыфіку вербальнай знакавай сістэмы на фоне іншых сістэм;

– з дапамогай вывучэння тэарэтычнай спадчыны вядучых семіёлагаў разумець асаблівасці семіятычнага падыходу да мастацкага тэксту;

– даць уяўленне аб розных падыходах да семіётыкі культуры;

– прадэманстраваць спецыфіку культуры як знакавай сістэмы на фоне іншых семіятычных сістэм і навучыць студэнтаў аперававаць культурна-семіятычным апаратам у даследаванні яе феноменаў;

– з дапамогай вывучэння тэарэтычнай спадчыны аўтараў, якія працавалі ў рэчышчы семіётыкі культуры, навучыць студэнтаў аналізаваць асаблівасці тэкстаў культуры.

*У выніку засваення вучэбнага курса “Асновы міжкультурных камунікацый” студэнты павінны ведаць:*

– асноўныя этапы развіцця семіятычнай тэорыі, а таксама тыпалогію семіятычных даследаванняў;

– асноўныя школы і напрамкі даследаванняў у гэтай вобласці;

– асноўныя канцэпты і дыскурсы дадзенай сферы даследаванняў;

– структуру знака і тэксту;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– механізмы семіятычнага канструявання сацыякультурнай рэальнасці.

*Студэнты павінны ўмець*:

– выяўляць знакі ў розных сферах камунікацыі;

– тлумачыць знакі і сімвалы культуры, дэманструючы высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі культуролага;

– валодаць навыкамі семіятычнай трактоўкі мастацкага тэксту, пры гэтым абапіраючыся на веды вербальнай сістэмы знакаў;

– выяўляць асаблівасці ўздзеяння тэкстаў на рэцыпіента (мастацкіх, публіцыстычных, рэкламных, а таксама – тэкстаў PR);

– канструяваць семіятычна значныя тэксты з улікам псіхалагічных і антрапалагічных асаблівасцей іх успрымання;

– праводзіць самастойныя даследаванні ў галіне семіётыкі на аснове атрыманых ведаў.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

У мэтах эфектыўнага засваення спецыяльнага курса ў працэсе семінарскіх заняткаў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– вусны аналіз тэкстаў паўсядзённай культуры;

– замацаванне ведаў з дапамогай стварэння эсэ на аснове культурна-семіятычнага аналізу феноменаў паўсядзённай культуры;

– распрацоўка прыкладнога аспекту даследавання на аснове засвоенага культуралагічнага апарату, якая ўключае прэзентацыю абранай студэнтамі тэмы на апошнім семінарскім занятку.

Павінны быць скарыстаны наступныя тэхналогіі навучання:

– тэхналогіі праблемнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, круглыя сталы, дыспуты і г.д.);

– ц’ютарскія тэхнікі, якія прадугледжваюць аналіз індывідуальных вынікаў самастойнай працы студэнтаў з актыўным удзелам іх аднакурснікаў.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, кіра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне самастойнай працай студэнтаў, вучэбна-метадычныя комплексы.

На вывучэнне дысцыпліны "Семіётыка культуры" вучэбным планам адводзіцца 110 навучальных гадзін, з іх 52 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: 28 – лекцыйных, 24 – семінарскія (практычныя).

Самастойная праца накіравана на пошук, аналіз і інтэрпрэтацыю неабходнай і дадатковай інфармацыі (навуковай і вучэбнай літаратуры, а таксама іншых інфармацыйных крыніц) і на творчую падрыхтоўчую працу.

Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семінары |
| **Уводзіны** | 2 | 2 | |
| **Тэма 1.** Тэарэтыка-метадалагічны інструментарый культуры: знак як культурны аб'ект у камунікатыўным працэсе | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 2.** Знак і сімвал: падабенства і адрозненне | | 2 | |
| **Тэма 3.** Знакавыя сістэмы і іх тыпы: вербальныя, графічныя, жэстамімічныя, іканічныя, вобразныя | 2 | 2 | |
| **Тэма 4**. Паняцце і тыпы “кодаў”; механізмы арганізацыі кодаў: парадыгма і сінтагма | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 5.** Семіёзіс: паняцце, дэфініцыі, падыходы | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 6**. Семіясфера як знакавая прастора | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 7.** Тэкст як сэнсавае поле культуры; функцыі тэксту | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 8.** Прыватныя семіётыкі. Біясеміётыка, лінгвасеміётыка, этнасеміётыка | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 9**. Семіётыка штодзённай культуры | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 10.** Семіётыка прасторы: жыллё і горад | 6 | 2 | 4 |
| **Тэма 11.** Семіётыка цела і адзення | 6 | 2 | 2 |
| **Тэма 12.** Семіётыка мастацтва (на прыкладзе кіно) | 4 | 2 | 2 |
| **Тэма 13.** Знак і знакавая сістэма ў тыпалогіі культуры; коды і тыпы культуры | 4 | 2 | 2 |
| **Разам…** | **52** | **28** | **24** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Прадмет і аб’ект семіётыкі культуры; задачы, мэты, структура дысцыпліны, яе сувязь з іншымі дысцыплінамі. Праблемнае поле і падыходы, асноўныя напрамкі і персаналіі.

Семіётыка як навука і як метад. Роля семіятычнага метаду ў сучаснай культуралагічнай адукацыі. Асноўныя напрамкі і персаналіі (Ф. дэ Сасюр, Ч. С. Пірс, Ч. Морыс, Р. В. Якабсон, Р. Барт, У. Эка, Ю. М. Лотман і ТМШ і інш.); канцэптуальны апарат семіётыкі. Семіятычнае разуменне культуры і мэты семіётыкі культуры.

### Тэма 1. Тэарэтыка-метадалагічны інструментарый культуры: знак як культурны аб’ект у камунікатыўным працэсе

Дэфініцыі знака. Знак і значэнне. Двухчасткавая мадэль знака (Ф. дэ Сасюр). “Выраз” і “змест” як структурныя характарыстыкі знака (Л. Ельмслеў). Трохчасткавая мадэль знака: рэферэнт, рэпрэзентант і інтэрпрэтанта (Ч. С. Пірс). “Трыкутнік Фрэге”. Уласцівасці знака (абмежаванасць, “уяўленне знака”, канвенцыйнасць, кантэкстуальнасць, сістэмнасць і інш.). Тыпы знакаў (па Ч. С. Пірсу): іконы, індэксы, сімвалы. Паняцці ўзроўняў сігніфікацыі – “дэнатата” і “канатацыі”. Міф як трэці ўзровень сігніфікацыі (Р. Барт).

### Тэма 2. Знак і сімвал: падабенства і адрозненне

Знак і сімвал. Дэфініцыі знака. Прырода і сутнасць знака. Чалавек як “сімвалічная жывёла” (Э. Касірэр, С. Лангер). Канвенцыйнасць як прынцып сімвалізацыі. Функцыі сімвалаў: акультурванне; абстрагаванне; медыятыўная (пасрэдніцкая) функцыя; функцыя аб’яднання калектыву; інтэнцыяльная функцыя і інш. Уласцівасці сімвала: знак як ёмішча сацыякультурнай інфармацыі; ўстойлівасць; кантэкстуальнасць і інш. Міфалагічны і сучасны тыпы сімвалізацыі. Знак і сімвал: падабенства і адрозненне. “Уяўленне знака” Р. Барта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 3. Знакавыя сістэмы і іх тыпы: вербальныя, графічныя, жэстамімічныя, іканічныя, вобразныя

Знакавыя сістэмы. Дэфініцыі знакавых сістэм. Тыпы знакавых сістэм: вербальныя, графічныя, жэстамімічныя, іканічныя, вобразныя. Сістэмы натуральных знакаў (на прыкладзе медыцынскай дыягностыкі). Вобразныя сістэмы знакаў (на прыкладзе мастацтва). Мова як знакавая сістэма. Узроўні ўжывання лінгвістычных знакаў: відавочны і латэнтны. “Langue” і “parole”.

### Тэма 4. Паняцце і тыпы “кодаў”; механізмы арганізацыі кодаў: парадыгма і сінтагма

Паняцце і дэфініцыі “кода”. Код і мова. Код і паведамленне. Код і кантэкст. Код і “шум” (У. Эка). Культура як макракод, іерархія кодаў. Макракод і мікракод (“лексікод”). Метафара як інструмент кода. Тыпы кодаў у культуры: сацыяльныя, тэкставыя, інтэрпрэтатыўныя. Механізмы арганізацыі кодаў: парадыгма і сінтагма. Выбар як прынцып парадыгмы. Парадыгматычны аналіз тэксту, яго асноўны інструментарый (бінарныя апазіцыі). Сінтагматычны (наратыўны) аналіз тэксту. Прыклад сінтагматычнага аналізу: асэнсаванне “бандыяны” У. Эка.

### Тэма 5. Семіёзіс: паняцце, дэфініцыі, падыходы

Семіёзіс: паняцце, дэфініцыі, падыходы. Структура семіёзіса па Ч. С. Пірсу: рэферэнт, рэпрэзентант, інтэрпрэтанта. Перанос акцэнтаў на працэс інтэрпрэтацыі. Структура семіёзіса па Ч. Морысу: узроўні семіёзіса (семантыка, сінтактыка, прагматыка). “Неабмежаваны семіёзіс” (У. Эка). Семіёзіс як камунікатыўны працэс (ТМШ). Камунікатыўная схема Р. В. Якабсона. Ю. М. Лотман аб семіёзісе як аб знакавым механізме культуры. Функцыянальная неабходнасць неразумення (няпоўнага разумення) у семіётыка-камунікатыўным працэсе. Асноўныя семіятычныя механізмы культуры: узнікненне і распад адзіных кодаў.

### Тэма 6. Семіясфера як знакавая прастора

Семіясфера: паняцце, дэфініцыі, падыходы (Ю. Лотман і С. Гусеў). Семіясфера як знакавая прастора, як адмысловае поле культуры. Прыкметы семіясферы: семіятычная нераўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мернасць; унутраная разнастайнасць; цэласнасць; абмежаванасць. Паняцце і функцыі "мяжы": фільтраванне іншародных тэкстаў; адаптацыя і перапрацоўка; стварэнне ўнутранай арганізацыі і знешняй дэзарганізацыі ("касмізацыя" і "хаатызацыя"); паскарэнне семіятычных працэсаў; сэнсаўтварэнне.

Ю. М. Лотман, М. М. Бахцін, В. С. Біблер аб мяжы. Паняцці семіятычных Цэнтра і перыферыі.

### Тэма 7. Тэкст як сэнсавае поле культуры; функцыі тэксту

Тэкст як сэнсавае поле культуры. Семіётыка як "тэкстуальны падыход". Структуралісцкае і постструктуралісцкае разуменне тэксту (Ж. Дэрыда, Р. Барт, Ю. Крысцева, А. Грэймас і інш.). Разуменне тэксту ў ТМШ (Тартуска-Маскоўскай школе семіятычных даследаванняў). Тэкст як камунікатыўная прастора. Тэкст як прылада, якая стварае сэнсы. Культура і тэкст: адносіны і скрыжаванні. Функцыі тэксту: функцыя сэнсаўтварэння; функцыі сацыялізацыі і інкультурацыі; функцыя нарматыўнай каардынацыі супольнасці; аксіялагічная функцыя і інш. "Адсутная структура" У. Эка.

### Тэма 8. Прыватныя семіётыкі. Біясеміётыка, лінгвасеміётыка, этнасеміётыка

Прыватныя семіётыкі. Біясеміётыка: параўнальны аналіз паводзінскіх знакавых стратэгій чалавека і жывёл (па Ю. Сцяпанаву). Лінгвасеміётыка: разуменне культуры праз ключавыя словы. Этнасеміётыка. Семіётыка беларускай традыцыйнай культуры.

### Тэма 9. Семіётыка штодзённай культуры

Аб'ект семіётыкі штодзённасці. А. Шутц, П. Бергер і Т. Лукман аб "жыццёвым свеце" і штодзённай свядомасці. Семіётыка паставы і рухаў цела. Кінэсіка. Праксеміка. Акулістыка. Нацыянальна-культурныя адрозненні ў семіётыцы паставы і рухаў цела (К. Сітарам, Р. Когдэл, Э. Хол і інш.).

### Тэма 10. Семіётыка прасторы: жыллё і горад

Традыцыйнае жыллё: крытэрыі (багацце, пасяленчы кантэкст, этнічная культура, дыяхроннасць). Семіятычныя якасці дома. Вонкавая і ўнутраная прастора традыцыйнага дома;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

межы паміж імі (дзверы, акно). Знакавая апазіцыя: “чырвоны кут” – печ. Мужчынскае і жаночае ў прасторы дома. Кампаратыўны аналіз савецкай і амерыканскай кватэр (П. Вайль, А. Геніс “Страчаны рай”). Семіётыка камунальнай кватэры (І. Уцехін “Нарысы камунальнага побыту”): апазіцыі “чыстае – бруднае”, “прыватнае – агульнае”). Семіётыка горада: Масква і Пецярбург як семіятычныя аб’екты. Мінск–Масква–Пецярбург: семіётыка-кампаратыўны аналіз.

### Тэма 11. Семіётыка цела і адзення

Семіётыка цела. Кантэкстуальнасць цялеснага канона і моды; іх культурная запатрабаванасць. Традыцыйныя кампаненты ў сістэме адзення (на прыкладзе пояса). Інавацыйныя кампаненты ў сістэме адзення (мода). Статусны характар моды. Семіётыка мужчынскага і жаночага цялеснага канона.

### Тэма 12. Семіётыка мастацтва (на прыкладзе кіно)

Полікодавы характар фільма. Тэхніка і гук. Праблема кадра. Узроўні кінамовы. Значэнне і сэнс кінавобраза. Мантаж. Структура і сюжэт кінанаратыву. Узроўні пабудовы кінатэксту. Знак–значэнне–роля.

### Тэма 13. Знак і знакавая сістэма ў тыпалогіі культуры; коды і тыпы культуры

Ю. М. Лотман “Праблема знака і знакавай сістэмы і тыпалогія рускай культуры XI–XIX стст.” Коды і тыпы культуры: семантычны, сінтаксічны, асемантычна-асінтаксічны і семантычна-сінтаксічны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

1. *Барт, Ролан*. Семиотика. Поэтика. Избранные работы / Ролан Барт. – М.: Прогресс, 1994. – 616 с.
2. *Ветров, А. А*. Семиотика и ее основные проблемы. Над чем работают о чем спорят философы / А. А. Ветров. – М.: ИПЛ, 1968. – 263 с.
3. *Лотман, Ю. М*. Семиосфера. Культура и взрыв. Внутри мыслящих миров. Статьи. Исследования. Заметки / Ю.М. Лотман. – СПб.: Искусство-СПБ, 2010. – 703 с.
4. *Моррис, Ч. У*. Основания теории знаков / Ч. Моррис // Семиотика / под ред. Ю.С. Степанова. – М.: Радуга, 1988. – С. 31–39.
5. *Пирс, Ч. С*. Начала прагматизма. Логические основания теории знаков / Ч. С. Пирс. – СПб.: Алетейя, 2000. – 352 с.
6. *Соссюр, Ф*. Труды по языкознанию / Ф. Соссюр. – М.: Прогресс, 1977. – 695 с. – (Языковеды мира).
7. *Степанов, Ю. С*. Семиотика / Ю. С. Степанов. – М.: Наука, 1971. – 146 с.
8. *Эко, У*. Отсутствующая структура. Введение в семиологию / У. Эко. – СПб.: Петрополис, 1998. – 432 с.

*Дадатковая*

1. *Барт, Р*. Мифологии / Р. Барт. – М.: Академический проект, 2008. – 351 с.
2. *Вайль, П*. Собрание сочинений: в 2 т. / П. Вайль, А. Генис. – Екатеринбург: У-Фактория, 2004. – 780 с.
3. *Гусев, С*. Смысл возможного. Коннотационная семантика / С. Гусев. – СПб.: Алетейя, 2002. – 192 с.
4. *Леви-Строс, К*. Структурная антропология / К. Леви-Строс. – М.: Эксмо, 2001. – 512 с.
5. *Лосев, А.Ф*. Проблема символа и реалистическое искусство / А. Ф. Лосев. – М.: Искусство, 1995. – 320 с.
6. *Лотман, Ю. М*. Беседы о русской культуре. Быт и традиции русского дворянства (XVIII – начало XIX века) / Ю. М. Лотман. – СПб.: Искусство-СПБ, 2008. – 413 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Лотман, Ю. М.* Непредсказуемые механизмы культуры / Ю. М. Лотман. – Таллинн: TLU Press, 2010. – 232 с. – (Bibliotheca Lotmaniana).

8. *Панов, Е. Н.* Знаки. Символы. Языки. Коммуникации в царстве животных и в мире людей / Е. Н. Панов. – М.: КМК, 2005. – 496 с.

9. *Почепцов, Г. Г.* Русская семиотика. Идеи и методы, персоналии, история / Г. Г. Почепцов. – М.: Рефл-бук: Ваклер, 2001. – 768 с. – (Образовательная библиотека).

10. *Пропп, В. Я.* Исторические корни волшебной сказки / В. Я. Пропп. – Л.: Изд-во Ленинградского университета, 1986. – 366 с.

11. *Сэпир, Э.* Избранные работы по языкознанию и культурологии / Э. Сэпир. – М.: Аудиториум, 1994. – 412 с.

12. *Утехин, И.* Очерки коммунального быта / И. Утехин. – М.: О.Г.И., 2001. – 215 с.

13. *Эко, У.* Открытое произведение. Форма и неопределенность в современной поэтике / У. Эко. – СПб.: Академический проект, 2004. –384 с.

14. *Юнг, К. Г.* Человек и его символы / К. Г. Юнг, М. Л. Франц, Д. Л. Хендерсон, И. Якоби, А. Яффе. – СПб.: Б.С.К., 1996. – 454 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЫТАННІ ДА ІСПЫТУ

1. Прадмет і аб’ект семіётыкі культуры; праблемнае поле і падыходы. Семіётыка як навука і як метад. Роля семіятычнага метаду ў сучаснай культуралагічнай адукацыі.

2. Знак як культурны аб’ект у камунікатыўным працэсе. Двухчасткавая і трохчасткавая мадэлі знака. Уласцівасці і тыпы знакаў.

3. Прырода і сутнасць знака, яго функцыі і характарыстыкі.

4. Знакавыя сістэмы. Тыпы знакавых сістэм. Мова як знакавая сістэма.

5. “Langue” і “parole”. Дэнатат і канатацыя.

6. Паняцце “кода”.

7. Семіёзіс: паняцце, дэфініцыі, падыходы.

8. Структура семіёзіса па Ч. С. Пірсу і па Ч. Морысу: узроўні семіёзіса (семантыка, сінтактыка, прагматыка).

9. Семіёзіс як камунікатыўны працэс. Камунікатыўная схема Р.В. Якабсона.

10. Ю. М. Лотман пра семіёзіс як знакавы механізм культуры.

11. Парадыгма і сінтагма.

12. Семіясфера: паняцце, дэфініцыі, падыходы.

13. Паняцце і функцыі “мяжы”. Паняцці семіятычных Цэнтра і перыферыі.

14. Тэкст як сэнсавае поле культуры.

15. Функцыі тэксту.

16. Лінгвасеміётыка: разуменне культуры пры дапамозе ключавых слоў.

17. Этнасеміётыка. Семіётыка беларускай традыцыйнай культуры.

18. Семіётыка паўсядзённай культуры.

19. Нацыянальна-культурныя адрозненні ў семіётыцы паставы і рухаў цела.

20. Семіётыка прасторы: жыллё.

21. Семіятычныя якасці дома.

22. Семіётыка горада.

23. Семіётыка адзення.

24. Семіётыка цялеснага канона.

25. Семіётыка мастацтва (на прыкладзе кіно).

26. Коды і тыпы культуры: семантычны, сінтаксічны, асемантычна-асінтаксічны і семантычна-сінтаксічны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СЕМІЁТЫКА КУЛЬТУРЫ**

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках)*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія (фундаментальная)*
*спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,44.
Тыраж экз. Заказ .

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ